## Семінар 7.
## Канстытуцыя як асноўны закон дзяржавы.
## Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Савецкія Канстытуцыі 1919, 1927, 1937, 1978 гг.** Перыяд 1917–1919 гг. акрэсліў пачатак выключна новага этапа ў развіцці заканадаўства Беларусі. Адбываецца станаўленне беларускай дзяржаўнасці. Існаванне на тэрыторыі Беларусі шматлікіх (часам нядаўгавечных) дзяржаўных утварэнняў, якія да таго ж ахаплівалі толькі частку яе тэрыторыі (да 1939 г.), прадвызначыла характарыстыку заканадаўства Навейшага часу Беларусі (з 1917—1918 гг.) як адну з найбольш складаных. Калі абмежавацца толькі агульнай характарыстыкай, то можна вызначыць наступныя (умоўныя і больш дробныя) перыяды: 1) 1917—1920 гг. — перыяд дзейнасці на тэрыторыі Беларусі кароткачасовых дзяржаўных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак; 2) 1921—1991 гг. — заканадаўства БССР (якое з 1939 г. уключала ўсю тэрыторыю рэспублікі); 3) з жніўня — верасня 1991 г. — заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

*Першы перыяд* — вынік барацьбы суседніх дзяржаў за тэрыторыю Беларусі. Для яго характарыстыкі можна было б прыняць вядомы выраз: найбольш яскравай рысай законнасці гэтага часу з'яўляецца яе адсутнасць. Сапраўды, заходняя і цэнтральная часткі Беларусі знаходзіліся пад акупацыяй, тут дзейнічалі законы ваеннага часу і распараджэнні акупацыйных улад. На ўсходзе Беларусі, дзе была ўстаноўлена ўлада Саветаў, захоўвалася ваеннае становішча. Велізарная колькасць дакументаў заканадаўчага характару выдавалася надзвычайнымі бальшавіцкімі органамі
— рэвалюцыйнымі камітэтамі, і вызначальную сілу для вырашэння лёсаў тысяч людзей мелі распараджэнні камандзіраў і РВС армій, палкоў, іншых вайсковых адзінак Чырвонай Арміі.
— У сакавіку 1918 г. другой *Устаўной граматай* была абвешчана *Беларуская Народная Рэспубліка*. Па сутнасці, пазначаны дакумент замацаваў дзяржаўны лад і асноўныя правы грамадзян. 25 сакавіка 1918 г. трэцяй Устаўной граматай абвяшчалася (упершыню ў гісторыі Беларусі) незалежнасць Беларускай Рэспублікі. Устаўныя граматы, як і іншыя дакументы БНР (напрыклад, «Аб грамадзянстве» ад 14.12.1919 г.), з'яўляюцца спецыфічнымі заканадаўчымі дакументамі. Дзейнасць іх норм абвяшчалася на тэрыторыі, якая не кантралявалася створанымі дзяржаўнымі органамі і для правядзення якіх у жыццё не існавала пэўнага механізма выканаўчай улады.

1 студзеня 1919 г. *Маніфест Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі* заявіў аб утварэнні *Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі*. У Маніфесце ўжывалася некалькі назваў рэспублікі. Спецыяльны пункт Маніфеста адмяняў усе законы і пастановы ўрада

БНР, што фактычна з'яўлялася прызнаннем існавання Беларускай Народнай Рэспублікі з боку савецкіх улад. Прынятая ў лютым 1919 г. Канстытуцыя ССРБ не была дакладна распрацаванай, і фактычна на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі законы РСФСР (юрыдычна яны былі ўведзены Пастановай Часовага рабоча- сялянскага ўрада Беларусі ад 10.1.1919 г.).

Апошнім з існаваўшых у адзначаны перыяд дзяржаўных утварэнняў на тэрытрыі Беларусі з'яўляецца Літоўска-Беларуская ССР (ЛітБел). На яе тэрыторыі побач з заканадаўчымі нормамі, прынятымі дзяржаўнымі органамі ЛітБел (Саветам абароны, СНК і інш. — аб усеагульнай працоўнай павіннасці, раўнапраўі нацый і г. д.), працягвалі дзейнічаць таксама законы Літоўскай і Беларускай савецкіх рэспублік. Новыя заканадаўчыя акты распаўсюджваліся на тэрыторыю ЛітБел спецыяльнымі пастановамі. Разам з тым на працягу ўсяго гэтага перыяду (канец 1917—1920 г.) значная колькасць законапалажэнняў была выдадзена надзвычайнымі органамі (напрыклад, Мінскім губернскім рэвалюцыйным камітэтам).

*Другі перыяд* развіцця заканадаўства на тэрыторыі Беларусі (1921—1991) таксама меў некалькі асобных этапаў: 1) этап заканадаўства БССР перыяду новай эканамічнай палітыкі; 2) афармленне адміністрацыйна-загаднай сістэмы (1928—1939); 3) заканадаўства перыяду Другой сусветнай вайны (1939—1945); 4) пасляваенны этап развіцця заканадаўства БССР (1945—1991).

Рэальныя змены ў дзяржаўна-прававым становішчы рэспублікі адбыліся *з 1921 г.* БССР была прызнана сусветнай супольнасцю, устанавіла дыпламатычныя зносіны з іншымі дзяржавамі, падпісала Саюзны дагавор 1922 г. З 1921 г. усе заканадаўчыя акты РСФСР, указы Прэзідыума яго ЦВК і СНК, пастановы неаб'яднаных наркаматаў набывалі сілу толькі тады, калі зацвярджаліся цэнтральнымі дзяржаўнымі органамі БССР. *Канстытуцыя СССР 1924 г.* замацавала раўнапраўнае становішча ўсіх рэспублік у яго складзе і новую заканадаўчую норму: законы, якія прымаюцца рэспублікамі, павінны адпавядаць законам СССР, пры разыходжанні перавагу маюць апошнія. На пачатку 1920-х гг. былі прыняты ў якасці законаў БССР грамадзянскі, крымінальны, крымінальна-працэсуальны кодэксы і Кодэкс законаў аб працы РСФСР. Улічваючы асаблівасці землекарыстання, быў распрацаваны асобны Зямельны кодэкс БССР. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя змены, што адбываліся на працягу 1921—1928 гг., замацавала *Канстытуцыя БССР 1927 г.* Яна ўпершыню размежавала функцыі заканадаўчай улады (з'езды Саветаў, ЦВК, яго Прэзідыума) і выканаўчай (СНК, створаны ў 1920 г.). Аднак у наступным, на працягу 1930-х гг., гэты прынцып не заўсёды вытрымліваўся.

*Другі этап пазначанага перыяду* (*1928—1939*) адрозніваўся не кардынальнай зменай палажэнняў заканадаўства, а рэальнымі парушэннямі з боку дзяржаўнай улады і кіруючай партыі дзеючых

прававых норм (напрыклад, замацаваных Канстытуцыяй БССР 1927 г. свабоды выбару форм землекарыстання, выкарыстання беларускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін у БССР і інш.). Характэрна спецыфічнае стаўленне да законаў, калі апошнія разглядаліся як «праграма дзеянняў». Да сярэдзіны 1930-х гг. былі дзясяткі найменняў дакументаў заканадаўства: *дэкрэт, маніфест, пастанова, рэзалюцыя.* З прыняццем Канстытуцыі СССР 1936 г. была ўведзена адзіная назва — «*закон*». Для дакументаў выканаўчай улады захаваны найменні «*пастанова*» і «*распараджэнне*».

Спецыфіку наступнага *этапа развіцця заканадаўства БССР* (*1939—1945*) складае шэраг дакументаў, якія былі выкліканы ўз’яднаннем Беларусі ў складзе адзінай дзяржавы і пачаткам ваенных дзеянняў на яе тэрыторыі. Першая з адзначаных падзей звязана з функцыянаваннем такога спецыфічнага (для БССР) інстытута, як Народны сход Заходняй Беларусі. Вядома, што права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты мелі пераважна органы часовага кіравання гарадоў і паветаў, якія зацвярджаліся камандаваннем Чырвонай арміі. Аднак у астатнім парадак выбараў у Народны сход быў даволі дэмакратычным: удзел прымалі ўсе грамадзяне, якія дасягнулі 18 гадоў, незалежна ад нацыянальнасці, веравызнання, маёмаснага становішча і г.д. Народны сход прыняў важнейшыя для Заходняй Беларусі заканадаўчыя рашэнні — аб устанаўленні савецкай улады, канфіскацыі памешчыцкіх зямель, нацыяналізацыі банкаў і буйных прадпрыемстваў, аб уваходжанні ў склад БССР.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны быў прыняты шэраг спецыяльных заканадаўчых дакументаў (напрыклад, Указ аб крымінальнай адказнасці за распаўсюджванне чутак, Закон «Аб адказнасці за пасобніцтва нямецка- фашысцкім акупантам» і інш.). У гады вайны працягваў заканадаўчую дзейнасць Вярхоўны Савет БССР. Частка яго дэпутатаў, Прэзідыум эвакуіраваліся ў Магілёў, Гомель, а пасля ў Маскву. Аднак важнейшыя заканадаўчыя рашэнні, якія датычыліся тэрыторыі Беларусі, прымаліся цэнтральнымі дзяржаўнымі органамі СССР (Дзяржаўным Камітэтам Абароны і інш.).

У развіцці заканадаўства *БССР пасляваеннага этапа можна прасачыць некалькі стадый.* Для *другой паловы 1940-х — пачатку 1950-х гг.* характэрна захаванне большасці важнейшых заканадаўчых норм і палажэнняў ваеннага часу (крымінальная адказнасць за адміністрацыйныя парушэнні, абавязковы мінімум працадзён і інш.). Важнейшыя законапалажэнні БССР звязаны з дэталізацыяй законаў, прынятых цэнтральнымі органамі СССР.

Новая стадыя ў пасляваенным заканадаўстве — *сярэдзіна 1950-х — 1980- я гг.* Яна характарызуецца паступовай грэабілітацыяй пацярпелых у гады культу асобы (сярэдзіна 1950-х гг.; другая палова 1980-х гг.); пашырэннем паўнамоцтваў саюзных рэспублік; распрацоўкай

рэспубліканскіх кодэксаў законаў у адпаведнасці з дзеючай канстытуцыяй. Заканадаўчыя паўнамоцтвы меў Вярхоўны Савет БССР, у перапынках паміж яго сесіямі выдаваліся ўказы Прэзідыума Вярхоўнага Савета (апошнія не павінны былі супярэчыць дзеючым законам). Савет Міністраў рэспублікі заканадаўчых функцый не меў, аднак на справе для гэтага перыяду характэрна вялікая колькасць падзаконных актаў, якія ў значнай ступені скажалі сэнс прынятых законаў.

Працэсы дэмакратызацыі ў СССР, якія закранулі прадстаўнічую сістэму, на мяжы 80—90-х гг. XX ст. распаўсюдзіліся і на Беларусь. Вынікам з’явіліся змены і дапаўненні ў Канстытуцыю 1978 г. Сярод іх найперш патрэбна адзначыць нормы, якія абмяжоўвалі паўнамоцтвы Прэзідыума Вярхоўнага Савета (ён быў пазбаўлены права прымаць указы нарматыўнага характару). У далейшым важнае значэнне набываюць Пастановы Вярхоўнага Савета.

Наступны, трэці, *перыяд пачаўся з 1991 г.*, калі ў жніўні Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларускай ССР (27.7.1990 г.) быў нададзены статус канстытуцыйнага акта. Найбольш характэрная рыса заканадаўства гэтага перыяду — вяршэнства законаў Рэспублікі Беларусь на яе тэрыторыі (са жніўня 1991 г. па сакавік асноўны з іх — Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, з 15 сакавіка 1994 г. — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь).

Першая савецкая канстытуцыя — Канстытуцыя РСФСР была прынята 10 ліпеня 1918 г. Усерасійскім з’ездам Саветаў. Яна стала асновай распрацоўкі канстытуцый іншых савецкіх рэспублік, у прыватнасці першай Канстытуцыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь (ССРБ). Апошняя была ўхвалена I Усебеларускім з’ездам Саветаў (люты 1919 г.) і мела шэраг адрозненняў. Па-першае, яна была разлічана на кароткачасовы перыяд і з’яўлялася менш распрацаванай (мела не 6 раздзелаў, а 3). Некаторыя важнейшыя канстытуцыйныя нормы (аб выбарчым праве, аб мясцовых органах улады і кіравання, аб бюджэтным праве) не знайшлі тут адлюстравання. Асобныя пункты замацавалі спецыфіку Беларусі: улічваючы, што большасць этнічнага беларускага насельніцтва — сяляне, Канстытуцыя ССРБ вызначыла, што «Беларуская Рэспубліка ёсць свабоднае сацыялістычнае грамадства ўсіх працоўных Беларусі», дзяржава «рабочага класа і бяднейшага сялянства». Як вядома, Канстытуцыя РСФСР — канстытуцыя дзяржавы «дыктатуры пралетарыяту» — забяспечвала пэўныя перавагі ў выбарчым праве для рабочага класа, і фактычна гэтыя нормы дзейнічалі на тэрыторыі ССРБ (пасля — БССР).

Утварэнне СССР выклікала неабходнасць заканадаўчага афармлення асноўных прынцыпаў саюзнай дзяржавы. Першая канстытуцыя СССР 1924 г. вызначала структуру вышэйшых органаў агульнасаюзнай улады і кіравання, іх кампетэнцыю. Асноўная асаблівасць гэтай канстытуцыі ў тым, што яна разглядала толькі пытанні новай саюзнай дзяржавы і не

датычылася аспектаў вызначэння асноў эканамічнага і палітычнага ладу, правоў і абавязкаў грамадзян і інш.

Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і гістарычнага развіцця нацыянальных рэгіёнаў былі замацаваны ў канстытуцыях саюзных рэспублік. Другая Канстытуцыя БССР распрацоўвалася на працягу некалькіх гадоў. Першы яе праект, прадстаўлены IV сесіі ЦВК VI склікання ў лютым 1925 г., не быў зацверджаны, паколькі ён празмерна пашыраў функцыі вярхоўных органаў БССР. Пасля дапрацоўкі (у 1927 г.) Канстытуцыя БССР юрыдычна афарміла добраахвотнае і свабоднае ўваходжанне БССР у склад СССР, адлюстравала пашырэнне сацыяльнай асновы Савецкай дзяржавы. У асобных артыкулах (20—23) Канстытуцыі 1927 г. быў дэталізаваны прынцып раўнапраўя нацый (раўнапраўя мясцовых — беларускай, яўрэйскай, рускай і польскай -- моў, статус беларускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін, прызнанне забеспячэння навучання на роднай мове, выданне важнейшых заканадаўчых актаў на ўсіх мясцовых мовах). Асноўная рыса Канстытуцыі 1927 г. — дакладнае размежаванне функцый дзяржаўных органаў: з’езд Саветаў і ЦВК БССР. Упершыню ў канстытуцыйным будаўніцтве рэспублікі Канстытуцыя 1927 г. рэгулявала ўзаемаадносіны СНК БССР з падпарадкаванымі яму органамі кіравання, замацоўвала прававы статус мясцовых органаў улады. Вызначала, што пытанні аб зменах тэрыторыі рэспублікі павінны разглядацца толькі на з’ездах Саветаў Беларусі. Канстытуцыя захавала за рэспублікай права свабоднага выхаду з Саюза.

У 1936 г. была зацверджана новая Канстытуцыя СССР, якая ўстанаўлівала аднастайнасць дзяржаўна-прававых норм на ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза (на яе аснове ў 1937 г. прынята чарговая канстытуцыя БССР). Важнейшым органам дзяржаўнай улады ў рэспубліцы абвяшчаўся Вярхоўны Савет, які выбіраўся тэрмінам на 4 гады і дзейнічаў на аснове Канстытуцый БССР і СССР. Пры гэтым кампетэнцыя заканадаўчых і выканаўчых органаў БССР была значна звужана.

Канстытуцыя 1937 г. дзейнічала па мерках савецкага часу даволі працяглы тэрмін (да 1978 г.), яе асобныя пункты неаднаразова змяняліся і дапаўняліся. У 1938 г. Канстытуцыя ўжо не змяшчала абавязковага прынцыпу публікацыі ўсіх важнейшых законаў на польскай і яўрэйскай мовах. У 1939 г. былі ўнесены папраўкі аб пашырэнні тэрыторыі БССР, у 1944 г. — аб пашырэнні паўнамоцтваў рэспублікі (стварэнні саюзна-рэспубліканскіх наркаматаў абароны і міжнародных спраў), у 1946 г. — аб перайменаванні наркаматаў у міністэрствы і г. д.

Апошняя Канстытуцыя БССР была прынята ў 1978 г. Яна, як і папярэдняя, у значнай ступені з’яўлялася адлюстраваннем і дэталізацыяй палажэнняў агульнасаюзнай канстытуцыі (у дадзеным выпадку — 1977 г.). Абвяшчэнне новых Асноўных законаў Саюза і рэспублік было выклікана пераважна ідэалагічнымі меркаваннямі, таму Канстытуцыя

1978 г. з’явілася яшчэ больш дэкларатыўнай (права на жыллё пры захаванні велізарных чэргаў, свабода сумлення пад ідэалагічным кантролем і г.д.). Адпавядаючы Канстытуцыі СССР 1977 г., Канстытуцыя БССР 1978 г. замацавала ролю кампартыі як «кіруючай і накіроўваючай палітычнай сілы».

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 1994 г.**

27 кастрычніка 1989 г. быў прыняты Закон “Аб зменах і дапаўненнях Канстытуцыі БССР”. Яго мэтай вызначалася развіццё дэмакратыі самакіравання народа, удасканаленне выбарчай сістэмы. 27 ліпеня 1990 г. была прынята *Дэкларацыя Вярхоўнага Савета аб дзяржаўным суверэнітэце.* Згодна з ёй на тэрыторыі Беларусі ўстанаўлівалася вяршэнства канстытуцыі і законаў рэспублікі над агульнасаюзнымі нормамі. Менавіта гэты дакумент з’явіўся юрыдычнай асновай для далейшага вырашэння лёсу федэратыўнай дзяржавы (СССР).

25 жніўня 1991 г. быў прыняты Закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце”. Упершыню ў практыцы заканатворчай дзейнасці найвышэйшага органа Беларусі быў прыняты канстытуцыйны закон. Ва ўмовах фундаментальных пераўтварэнняў пачатку 1990-х гг. Канстытуцыя БССР 1978 г. імкліва пераўтварылася ў архаічны дакумент.

Пачатак працы над новай Канстытуцыяй быў пакладзены 22 чэрвеня 1990 г. пастановай Вярхоўнага Савета БССР “Аб утварэнні Канстытуцыйнай камісіі”, персанальны склад Канстытуцыйнай камісіі (74 чалавек) быў выхначаны 20 ліпеня 1990 г.

Да сярэдзіны 1991 г. праект новай канстытуцыі быў падрыхтаваны і ўвосень гэтага года перададзены на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета, прапанаваны да апублікавання. Істотныя дыскусіі разгарнуліся вакол формы кіравання: прэзідэнцкая або парламенцкая рэспубліка. Абмаркаванне Асноўнага Закона краіны адбывалася наступным чынам: дэпутаты прымалі або адхілялі раздзел, артыкул цалкам, а пры неабходнасці аб’яўлялася паўторнаеа галасаванне.

Урэшце, *15 сакавіка 1994* г. Вярхоўны Савет канстытуцыйнай большасцю ў 236 галасоў (пры неабходных 231) прыняў Канстытуцыю цалкам, і затым 237 галасамі быў прыняты Закон «Аб парадку ўступлення ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь». Каля паловы артыкулаў Канстытуцыі прысвечаны правам і свабодам.

Каля падовы артыкулаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прысвечаны правам і свабодам. Яе характэрныя рысы:

1) Устанаўленне роўнасці дзяржавы і грамадзяніна;
2) Замацаванне ў якасці эканамічнай асновы разнастаўных формаў уласнасці;
3) Раздзяленне і ўзаемадзенянне ўлад (заканадаўчай, выканаўчай, судовай).

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь – асноўны закон Рэспублікі Беларусь, які мае вышэйшую юрыдычную сілу і замацоўвае асноўныя прынцыпы і нормы прававо́га рэгулявання важнейшых грамадскіх адносін. Да юрыдычных уласцівасцей Канстытуцыі адносяць: устаноўчы характар; вяршэнства як юрыдычнага дакумента ў сістэме права; прамое дзеянне; стабільнасць; асаблівую ахову; выніковы характар і замацаванне перспектыў развіцця грамадства; сістэмаўтваральны дакумент для заканадаўства.

Істотныя змены ў Канстытуцыю былі ўнесены на рэспубліканскіх рэферэндумах (1996, 2004, 2022 г.). За ўвесь час існавання суверэннай Беларусі было праведзена чатыры рэспубліканскія рэферэндумы.

Другі ў гісторыі Рэспублікі Беларусь рэферэндум быў праведзены **24 лістапада 1996 г.** Па афіцыйных выніках рэферэндуму былі падтрыманы прапановы Прэзідэнта (аб пераносе Дня Незалежнасці на 3 ліпеня і аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю) і адхілены ўсе прапановы Парламента Рэспублікі Беларусь.

На рэферэндум былі прадстаўлены два праекты новай рэдакцыі Канстытуцыі -- Прэзідэнтам і парламентам (фракцыямі аграрыяў і камуністаў), якія насілі ўзаемавыключальны характар. Прэзідэнцкі варыянт Канстытуцыі, прыняты на рэспубліканскім рэферэндуме, стварыў цалкам новую мадэль дзяржаўнага ладу Беларусі. У ім найбольш паслядоўна замацавана рэалізацыя прынцыпу падзелу ўлад, адноўлена раўнавага трох галін улады, баланс паміж абавязкамі і правамі кіраўніка дзяржавы, умацаваны статус выканаўчай улады ў сістэме дзяржаўных органаў і яе роля ў кіраванні дзяржавай і грамадствам, што адлюстроўвае сусветную тэндэнцыю другой паловы XX ст.

Трэці рэспубліканскі рэферэндум адбыўся **17 кастрычніка 2004 г.** па ініцыятыве Кіраўніка дзяржавы. Па яго выніках была падтрымана прапанова Прэзідэнта аб унясенні дадатковых змяненняў у Канстытуцыю.

Рэспубліканскі рэферэндум па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь адбыўся **27 лютага 2022 г.** Па даных Цэнтрвыбаркама Беларусі ў галасаванні прыняло удзел амаль 5,4 млн. грамадзян, 82,86 % з якіх выказаліся за змены і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Новая рэдакцыя Канстытуцыі – гэта яшчэ адзін крок да ўмацавання незалежнасці краіны. У Канстытуцыі ажыццяўляецца пераход ад звышпрэзідэнцкай да прэзідэнцкай рэспублікі, у якой важную ролю выконвае выканаўчая ўлада.

У новай рэдакцыі Канстытуцыі ўдакладняюцца патрабаванні да кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, яго паўнамоцтвы абмяжоўваюцца двума трэмінамі па 5 гадоў кожны. У артыкуле 80 абвяшчаецца, што Прэзідэнтам можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь па нараджэнні, не маладзейшы за 40 гадоў, які пастаянна пражывае ў Беларусі не менш за 20 гадоў.

Усебеларускі народны сход у артыкуле 88 надзелены правам пазбаўлення пасады Прэзідэнта – у выпадку сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі або ў выпадку дзяржаўнай здрады.

З Канстытуцыі вынікае наступная **іерархія нарматыўных прававых актаў:**

1) Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь;
2) Рашэнні рэферэндумаў;
3) Рашэнні Усебеларускага народнага сходу;
4) Законы;
5) Указы;
6) Пастановы Савета Міністраў;
7) Рашэнні іншых дзяржаўны органаў.

Не дапускаецца заключэння міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі.

**Развіццё інстытута кіраўніка дзяржавы ў айчыннай гісторыі**.

У сучаснай беларускай палітычнай сістэме каласальнае значэнне мае інстытут прэзідэнцтва. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з’яўляецца Кіраўніком беларускай дзяржавы. Кіраўнік дзяржавы гістарычна – альбо манарх, альбо прэзідэнт. Славянская дзяржаўнасць ужо на ранніх этапах развіцця не ўяўлялася без гэтага інстытута – кіраўніка дзяржавы, вярхоўнага кіраўніка, князя (караля).

Функцыі кіраўніка ў раннефеадальных славянскіх дзяржавах супадаюць з функцыямі дзяржавы. Для раннефеадальнай перыяду можна смела сцвярджаць аб супадзенні інстытутаў дзяржаўнасці і вярхоўнай улады. Кіраўнік у свядомасці падданых і суседзяў ўвасабляў сабой саму дзяржаву, бо менавіта ён распаўсюджваў сваю ўладу на пэўныя землі, якія з’яўляюцца дзяржаўнай тэрыторыяй. На ранніх этапах развіццё інстытута княжацкай улады фігура князя ўяўляецца выключна службовай. Князь выконваў грамадска-карысную «працу», якую яму даручала насельніцтва. Паказальныя ў гэтых адносінах прыклады паклікання-запрашэння князёў з іншага асяроддзя, у тым ліку іншаэтнічнага, якія складалі «рад» (дамову) з насельніцтвам. Кіруючая асоба ўяўляла сабой натуральны сімвал краіны, менавіта з ёй асацыявалася стаўленне да дзяржавы, фармавалася пачуццё патрыятызму.

Інстытут княжацкай улады быў звязаны з шэрагам функцый, якія да гэтага часу працягваюць заставацца прэрагатывамі Кіраўніка дзяржавы.

**Вярхоўны галоўнакамандуючы.** Адным з першарадных абавязкаў князя было асабістае правадырства ўзброенымі сіламі, клопат аб абараназдольнасці краіны. Усе пытанні, звязаныя з фарміраваннем узброеных сіл (дружыны), стварэнні сістэмы ўмацаванняў, ахове межаў, знаходзіліся пад яго кантролем. Па сутнасці, князь выконваў функцыі вярхоўнага галоўнакамандуючага.

**Падатковая сістэма.** Фінансы пераходзяць у кампетэнцыю князя, які сам усталёўваў даніны-падаткі і спаганяў іх з дапамогай сваіх органаў прымусу. Вярхоўны кіраўнік меў прэзентацыйныя функцыі, прадстаўляў

сваю дзяржаву за мяжой. Яшчэ адну функцыю вярхоўнага кіраўніка славянскіх дзяржаў можна вызначыць як забеспячэнне эканамічных узаемасувязей са знешнім светам. Менавіта вярхоўны кіраўнік рэгуляваў знешні гандаль, забяспечваючы ахову гандлёвых шляхоў, складаючы міжнародныя дамовы, улічваючы пры гэтым і эканамічныя інтарэсы дзяржавы.

**Судовая функцыя.** У кампетэнцыю князя пераходзіць таксама судаводства. Князь выступаў у ролі вярхоўнага арбітра, які згладжвае супярэчнасці паміжрознымі гру могуць прывесці да распаду дзяржаўнага арганізма. **Функцыя кантролю за зямельным фондам.** Князь у славян, з моманту зараджэння дзяржавы, яшчэ з племяннай эпохі, атрымаў у спадчыну і права вярхоўнага уласніка на зямлю. На князя пераносіцца права племені на зямлю.

Князь становіцца вярхоўным і нават непасрэдным уласнікам усёй зямлі ў дзяржаве.

Але важней тое, што ў моцнай княжацкай уладзе былі зацікаўлены ўсе пласты раннефеадальнай грамадства. У сярэдневяковым грамадстве глыбока адчувалася атаясамленне інстытута вярхоўнай улады з яго патрэбамі і чаканнямі.

Дзяржава без інстытута яе кіраўніка немагчыма, як немагчымы парадак і нармальнае існаванне сям'і без яе кіраўніка – бацькі. Для нашага народа кіраўнік дзяржавы – гэта вярхоўны арбітр, які стаіць над групавымі інтарэсамі і эгаістычнымі памкненнямі асобных груп грамадства. Яго галоўная задача – справядлівы закон для ўсіх.

Практычна кожны славянскі народ ранняга сярэдневякоўя стварае вобраз ідэальнага ўладара. Такой сакральнай асобай, валодаўшай звышнатуральнымі ўласцівасцямі, для сваіх сучаснікаў выступае Усяслаў Чарадзей. Усяслаў выдатна рабіў сваю княжацкую справу, тым і ўрэзаўся ў памяць сучаснікам.

Князя Вітаўта можна разглядаць як асноўнага пераемніка традыцыі абагаўлення манарха, створанай яшчэ ў Кіеўскай Русі. Вітаўт у беларускім фальклоры выступае як тыпова міфалагізіраваны персанаж, эпічная, сакральная постаць. Імя Вітаўта захавалася ў фальклоры, легендах і паданнях беларускага народа, якія былі запісаны этнографамі ў XIX--XX ст. Вобраз Вітаўта, мудрага кіраўніка, які выступае ў якасці ідэальнага гаспадара, караючага «злых», і міласэрнага у адносінах да «добрых», кіраўніка рэфарматара, кіраўніка, які стаяў на варце закона і інтарэсаў усіх яго падданых, менавіта такі, кампліментарны і пазбаўлены ад негатыву вобраз гэтага манарха замацоўваецца і ў беларускай гістарыяграфіі XIX ст.

Тэрмін «прэзідэнт» у перакладзе з лацінскай мовы азначае «той, хто сядзіць наперадзе». Мабыць, у антычныя часы прэзідэнтам называлі старшынствуючых на розных сходах. Ад гэтага першапачатковага значэння пасля ўзнікла такая пасада, як прэзідэнт сената. У цяперашнім разуменні тэрмін «прэзідэнт» пачаў ужывацца толькі з канца XVIII ст., калі

быў заснаваны інстытута прэзідэнцтва ў ЗША.

Узнікненне інстытута прэзідэнцтва ў свеце было звязана з пошукам ЗША новага спосабу арганізацыі дзяржаўнага кіравання, які прадугледжвае стварэнне моцнай выканаўчай улады і ў той жа час які выключае магчымасць яе ператварэння ў тыранію.

Задуманы першапачаткова як частка выканаўчай улады прэзідэнт ЗША замяніў у свядомасці грамадзян манарха і стаў ажыццяўляць функцыі кіраўніка дзяржавы. Сучаснае ўяўленне пра прэзідэнта як раз і грунтуецца на атаясамліванні яго з кіраўніком дзяржавы. Эфектыўнасць функцыянавання прэзідэнцтва ў ЗША спрыяла распаўсюджванню гэтага інстытута ў свеце. Сёння прэзідэнцтва – неад'емны элемент сусветнай палітычнай практыкі. 143 краіны, з іх 140 -- члены ААН, маюць у сваім дзяржаўным ладзе інстытут прэзідэнцтва.

**Прэзідэнцкая рэспубліка як форма дзяржаўнага кіраўніцтва.**

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь займае асаблівае месца ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Згодна з арт. 79 Канстытуцыі ён з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Прэзідэнт увасабляе адзінства народа, гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі.

Кіраўнік дзяржавы прымае меры па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць, пераемнасць і ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады, ажыццяўляе пасрэдніцтва паміж органамі дзяржаўнай улады.

Дадзеныя канстытуцыйныя палажэнні з'яўляюцца універсальнымі і ахопліваюць увесь спектр функцый (прадстаўнічыя, кіраўніцкія, гарантыйныя і іншыя), што рэалізуюцца Кіраўніком дзяржавы ў працэсе дзяржаўнага кіравання.

Асноватворныя паўнамоцтвы Прэзідэнта пералічаны ў арт. 84 Канстытуцыі, а таксама ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 21 лютага 1995 г. «Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь» і іншых заканадаўчых актах.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь -- гарант Канстытуцыі.

У сувязі з гэтым у рамках прадастаўленых яму паўнамоцтваў ён ажыццяўляе кантроль за тым, каб усе дзяржаўныя органы, арганізацыі і службовыя асобы дзейнічалі ў межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства.

Кіраўнік дзяржавы мае права як па сваёй ініцыятыве, так і на падставе паступаючых да яго зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб ініцыяваць вытворчасць аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь. Больш дэталёва дадзеная функцыя рэгламентавана ў палажэннях Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб

судаўладкаванні і статусе суддзяў і Закона Рэспублікі Беларусь ад 8 студзеня 2014 г. «Аб канстытуцыйным судаводстве».

У сферы ўзаемадзення з выканаўчай уладай Прэзідэнт з папярэдняй згоды Палаты прадстаўнікоў назначае на пасаду Прэм'ер-міністра; вызначае структуру Урада. У сферы ўзаемаадносін з судовай уладай Прэзідэнт з папярэдняй згоды Савета Рэспублікі назначае на пасаду Генеральнага пракурора, Старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Прэзідэнт як гарант Канстытуцыі:

мае права адмяняць акты Урада Рэспублікі Беларусь;

непасрэдна або праз ствараемыя ім органы ажыццяўляе кантроль за захаваннем заканадаўства мясцовымі органамі кіравання і самакіравання;

мае права прыпыняць рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў і адмяняць рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у выпадку неадпаведнасці іх заканадаўству.

Іншымі словамі, Кіраўнік дзяржавы забяспечвае ажыццяўленне належнага нарматворчага кантролю ў мэтах безумоўнай абароны канстытуцыйных палажэнняў і захавання прынцыпу вяршэнства права.

Прэзідэнту дадзена права ініцыяваць разгляд пытання ў Парламенце Рэспублікі Беларусь аб змяненні і дапаўненні Канстытуцыі, а таксама выносіць адпаведнае пытанне на рэспубліканскі рэферэндум.

***Прэзідэнт – Галоўнакамандуючы Узброенымі сіламі Рэспублікі Беларусь.*** Прэзідэнт ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і прымяненнем ваеннай арганізацыі дзяржавы з мэтай забеспячэння ваеннай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Беларусь свядома выбрала мадэль прэзідэнцкай улады. Інстытут прэзідэнцкай улады найбольш адпавядае гістарычнай і палітычнай традыцыі нашага народа. Моцная ўлада ў форме прэзідэнцтва адпавядае ментальным установкам, матывацыйным паводзінам, якія характарызуюць беларускі народ.